телеси, и о будущемъ суде, и о муце" (прытча гэтая мае другую назву —"Аповесць аб сляпцы і храмцы"). Епіскап Кірыла не толькі ерась Феадорца выкрываў, але і Андрэю Багалюбскаму напісаў шмат пасланняў. Яны, на жаль, не захаваліся. Тая гісторыя скончылася так: князь выракся Феадорца, той быў жорстка пакараны.

Усё гэта сведчыць пра тое, што К.Тураўскі быў аддады ідэі незалежнасці роднага княства і ідэі адзінства, што зыходзіла са стольнага Кіева.

Аўтар навуковых прац, прысвечаных К.Тураўскаму, Аляксей Мельнікаў адзначаў: Кірыла Тураўскі зрабіў надзвычай многа для беларускага народа. Па-першае — як дыпламат у Кіеве, Суздалі. Па-другое — як настаўнік, перакладчык Бібліі, прапагандыст хрысціянскай веры. Па-трэцяе — як храмабудаўнік. Па-чацвёртае — як літаратар. Асветнік напісаў велізарную па тым часе колькасць твораў. Толькі дэталёвае вывучэнне іх усіх дасць канчатковае ўяўленне пра асобу К.Тураўскага, яго светапогляд і маштаб яго літаратурнага таленту. Высветліць гэта — значыць высветліць ролю святцеля ў гісторыі сваёй эпохі, свайго народа, славянскага свету ў цэлым. Пакуль яна застаецца недаацэненай.

Такім чынам, вывучэнне рэлігійна-асветніцкай і літаратурнай дзейнасці Кірылы Тураўскага красамоўна паказвае, што культура беларускага народа ўжо тады выяўляла сваю арыгінальнасць, самабытнасць.

**Густава Л.А.,**
*суіскальнік кафедры*
*харавога мастацтва*

## ДУХОЎНАЯ МУЗЫКА Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ

Рэлігійная музыка — той скарб, які доўгія дзесяцігоддзі быў схаваны ад нас. Гэтая музыка ачышчае душу чалавека, дапамагае пераадолець жыццёвыя цяжкасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзве мацнейшыя царквы на Беларусі, праваслаўная і каталіцкая, аб'ядналі ў веры і любові да хрысціянства шматлікія пакаленні выдатных кампазітараў, дырыжораў, спевакоў, якія пакінулі пасля сябе каштоўную спадчыну.

Калі ў цяжкія гады забароны рэлігіі каталіцкая музыка з лацінскімі тэкстамі ўключалася ў рэпертуар харавых калектываў, гучала са сцэны, то праваслаўную музыку з кананічнымі тэкстамі на царкоўнаславянскай мове можна было пачуць выключна ў праваслаўнай царкве на богаслужэнні. А вось цяпер няма на Беларусі хору, які не спяваў бы духоўнай музыкі на кананічныя тэксты праваслаўнай царквы.

Духоўная музыка — аснова рэпертуару Акадэмічнага хору Нацыянальнай радыёкампаніі нашай рэспублікі. Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор хору — народны артыст СССР і БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі В.Роўда. Ён глыбока ведае, разумее духоўную музыку. Сын святара, выхаванец семінарыі, В.Роўда атрымаў духоўную адукацыю. Ён кіруе таксама студэнцкім хорам Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, многія выпускнікі якой становяцца рэгентамі ў храмах рэспублікі.

З шэдэўрамі рэлігійнай музыкі знаёмяць нас Дзяржаўны камерны хор (мастацкі кіраўнік І.Мацюхоў), Дзяржаўная акадэмічная капэла імя Р.Шырмы (мастацкі кіраўнік Л.Яфімава), Гродзенская харавая капэла (мастацкі кіраўнік Л.Іконнікава), камерны хор Магілёўскай філармоніі "Унія" (маст. кір. К.Насаеў), Акадэмічны народны хор імя Р.Цітовіча (мастацкі кіраўнік М.Дрынеўскі), Полацкі камерны хор (мастацкі кіраўнік Л.Жукава), хор Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (мастацкі кіраўнік Т.Слабодчыкава) і інш.

Многія харавыя калектывы, прафесійныя і аматарскія, выконваюць беларускую праваслаўную музыку. Творы беларускіх кампазітараў-эмігрантаў распаўсюджвае нястомны Г.дэ Пікарда, супрацоўнік музычнага аддзела Беларускай бібліятэкі імя Ф.Скарыны ў Лондане. Гэты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалавек з маладых гадоў захоплены беларускай музыкай. Музыка М.Анцава, М.Куліковіча-Шчаглова, А.Валынчыка, М.Равенскага, А.Туранкова, М.Бутомы і іншых раней гучала ў праваслаўных храмах на богаслужэннях, цяпер гучыць і ў канцэртных залах.

Рэлігійную музыку пісалі вядомыя кампазітары ўсіх часоў і народаў, у тым ліку і беларускія. Многія з іх былі рэгентамі (г.зн. дырыжорамі царкоўных хароў), складалі музыку для кліросных хароў, пасля эмігрыравалі. Музыка гэтых кампазітараў вытрымана ў лепшых традыцыях чатырохгалосага харавога пісьма. У творах М.Куліковіча-Шчаглова, выпускніка Пецярбургскай кансерваторыі, вучня М.Рымскага-Корсакава, сустракаюцца і апрацоўкі старажытных манадычных песнапенняў супрасльскага, мірскага, яблачынскага, пінскага напеваў, і складаныя гарманічныя пабудовы. Кампазітар добра ведаў старажытныя спевы, знаменны і пуцявы распевы, пра што сведчаць яго "Адзінародны Сыне", "Верую", екценні. М.Куліковіч-Шчаглоў добра валодаў тэхнікай і сучаснага харавога пісьма. У "Цяпер адпускаючы" прасочваюцца імітацыйнае развіццё, пластычнасць голасавядзення. А "Міласць міру" і "Табе спяваем"— лепшыя па шчырасці, глыбіні пачуцця з вядомых нам духоўных твораў кампазітара.

Віцяблянін М.Анцаў — кампазітар, хормайстар, выкладчык у традыцыйнай для XIX ст. манеры харавога гарманічнага пісьма. Яго творам не ўласцівы прыгожыя мелодыі, але гучаць яны свежа і неардынарна дзякуючы выкарыстанню неакордавых гукаў, гарманічнага мажору, працяглага адхілення, паліфанічнага ўступання галасоў.

Імя М.Равенскага шырока вядома ў рэспубліцы ў сувязі з яго гімнам "Магутны Божа" (словы Н.Арсенневай), што ўключаецца ў рэпертуар многіх хароў як неафіцыйны гімн Беларусі. Гэтую музыку людзі звычайна слухаюць стоячы. М.Равенскі перад вайной працаваў рэгентам у храме св. Аляксандра Неўскага у г. Чэрвені. Яго творы, як творы большасці вядомых беларускіх царкоўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кампазітараў, вызначаюцца фактурай, невялікім дыяпазонам, нескладанай гармоніяй. Іх могуць выконваць невялікія і непрафесійныя кліросныя хары. На мелодыку М.Равенскага аказвала ўплыў народная песня. У некаторых сваіх творах для царквы ён прама ўказвае на народную крыніцу мелодыі.

Шырока папулярны творы А.Туранкова. Гэта нескладаныя кампазіцыі для змяшанага хору, прызначаныя для богаслужэння, некалькі трапароў для жаночага трохгалосага хору і віртуозныя канцэрты.

У галіне беларускай царкоўнаславянскай праваслаўнай культуры працавалі А.Валынчык (пра яго вядома мала: вучыўся ў Варшаве, працаваў у Вільні, Гародні), Саломка (нам вядома толькі прозвішча, ён жыў на Гомельшчыне), М.Бутома.

Мікалай Уладзіміравіч Бутома 18 гадоў працаваў рэгентам у храмах Гомеля. Ён пісаў богаслужэбную музыку як для сваіх хароў, так і для іншых харавых калектываў. Больш за 300 твораў для царкоўнай службы, больш за 20 харавых канцэртаў М.Бутомы гучаць у храмах Гомеля і Гомельшчыны, Барнаула, Бранска, Санкт-Пецярбурга, Кіева, Чарнігава, Луцка, Паўлаўска, Мінска і інш. Спяваюць яго творы таксама аматарскія і прафесійныя калектывы. Некаторыя царкоўныя хары карыстаюцца "Абіходам царкоўнага спеву" М.Бутомы.

Яго музыка меладычная, яна класічна гарманізавана, мае малітоўны характар, даступная: аўтар добра ведаў палітру і магчымасці царкоўнага хору.

Сучасныя беларускія кампазітары таксама звяртаюцца да рэлігійнай тэматыкі. Мяркуем, што гэта не даніна модзе, а патрэба душы.

Трагічная малітва Э.Наско "Ратуй нас, Божа", літургічныя песнапенні В.Капыцько, прысвечаныя памяці айца А.Меня, "Усяночная" С.Бельцюкова, "Літургія" А.Залётнева — гэта першыя спробы нашых прафесійных кампазітараў у галіне духоўнай музыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цікавая рэлігійная музыка айца Андрэя Бандарэнкі. Ён адзіны ў сучаснай Беларусі святар, хто піша музыку, адзіны прафесійны кампазітар, які служыць у царкве, перажывае за царкву, добра ведае яе жыццё, разумее дух царквы.

Богаслужэбная музыка праваслаўнай царквы нарадзілася ў манаскім асяроддзі, адрознівалася строгасцю, стрыманасцю. З цягам часу богаслужэбная музыка набывала больш свецкі характар; былі ў гісторыі царкоўнай культуры часы, калі царкоўныя кампазітары бралі прыклад з арый італьянскай оперы. XIX ст. вярнула царкоўнай музыцы малітоўнасць, традыцыйнасць, цікавасць да старадаўняй манодыі, жаданне гарманізаваць старажытны знаменны распеў, зрабіць яго даступным для выканання сучаснымі царкоўнымі харамі. Царкоўную музыку стваралі кампазітары, якія ўвабралі дух царквы, малітвы з дзіцячых гадоў. Амаль усе вядомыя кампазітары, якія стваралі духоўную музыку, служылі ў царкве альбо спявалі ў царкоўным хоры.

Айцец Андрэй аднавіў гэтую традыцыю. Ён скончыў музычнае вучылішча як піяніст, Беларускую кансерваторыю як кампазітар (вучыўся ў Дз.Смольскага), потым асістэнтуру, хутка стаў папулярным, паказаў сябе ўдумлівым, сур'ёзным музыкантам. А.Бандарэнка некалькі гадоў кіраваў Гродзенскай харавой капэлай, якая і давала жыццё шматлікім творам пладавітага кампазітара.

Ён звязаў сябе з праваслаўнай царквой яшчэ ў сямідзесятыя гады, калі хадзіць у храм было небяспечна і зусім не модна. А.Бандарэнка быў рэгентам Гродзенскага кафедральнага сабора, пасвячоным чытальнікам, дыяканам і, нарэшце, стаў святаром.

Музыка айца Андрэя выяўляе яго ўнутраны свет, сцвярджае дабро, справядлівасць. Ідэі хрысціянскай любові ляжаць у аснове многіх свецкіх твораў кампазітара: оперы "Князь Наваградскі" (упершыню ў беларускай оперы з такой сілай выказаны ідэі хрысціянства), Канцэрта-паэмы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

для сімфанічнага аркестра, скрыпкі, габоя, віяланчэлі і фартэпіяна, у аснове якога ляжыць "Аповесць мінулых гадоў", харавога канцэрта "Пахвала Вялікаму князю Уладзіміру Святаслававічу", канцэрта для хору "Вячэрняя малітва" (словы С.Грахоўскага) і інш. Карыстаючыся новымі выразнымі сродкамі, дасягненнямі ў галіне кампазітарскай тэхнікі, А.Бандарэнка стварае сучасную канцэпцыю духоўнай музыкі. У 90-я гады XX ст. ім напісаны "Літургія св.Іаана Златавуста", "Малітва на замірэнне варагуючых".

Музыка айца Андрэя адлюстроўвае яго разуменне вобразнай сферы кананічнага тэксту і можа быць для некаторых складанай для ўспрымання У аснове яго музыкі — інтанацыі старажытнага аднагалосся, толькі ажыццяўляюцца яны ў гарманічнай тэмбравай форме. Гукавая палітра духоўных твораў кампазітара тонкая, разнастайная, маляўнічая; акварэльнасць спалучаецца і з ювелірным мазком, і з шырокай меладычнай фразай.

Праваслаўная музыка нясе дух пакорлівасці, любові да Бога, людзей. Прыгажосць гэтай музыкі -- духоўная, што і ёсць сапраўдная прыгажосць, як вучаць айцы царквы.

**Калацэй В.В.,**
*аспірант кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## ПРА ЭТНАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ ВОПЫТУ ВЫВУЧЭННЯ ПЕСЕННАЙ КУЛЬТУРЫ ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ

Песенная культура Паўночнай Беларусі мае даволі працяглую гісторыю вывучэння. У этнаграфічных выданнях канца XIX—пач. XX ст. песням Віцебшчыны ўжо было адведзена значнае месца. Між тым вядома: любая з'ява культуры пераходзіць у акадэмічных ведах у больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ